**ТЭМА: Бялынічы – мой лёс, Бялынічы – мая Радзіма.**

**МЭТЫ:** сістэматызаваць веды пра агульны стан развіцця літаратуры Прыдруцкага краю;

фарміраваць у вучняў уяўляе пра ролю асобы ў гісторыі і яе адказнасць за самога сябе;

развіваць нацыянальную самасвядомасць і грамадзянскую пазіцыю;

выхоўваць любоў да роднага краю, гонар за сваіх землякоў.

**ФОРМА ПРАВЯДЗЕННЯ:** інтэлектуальны рынг.

Калі б вось так! Калі б ды кожны
З маленства думаў, з першых лет:
Які – ці светлы, ці прыгожы –
Пакіне ў памяці ён след!

Н.Гілевіч

**Вядучы 1:** Добры дзень, сябры! Мы рады вітаць вас на конкурсна-пазнавальнай гульні "Бялынічы – мой лёс, Бялынічы – мая Радзіма", якая праводзіцца сёння ў форме інтэлектуальнага рынгу.

**Вядучы 2:** На працягу значнага часу мы знаёміліся з краязнаўчым матэрыялам пра літаратуру Прыдруцкага краю, займаліся пошукавай работай. Сёння праверым і замацуем свае веды ў час гульні.

**Вядучы 1:** Сярод народа бытуе думка, што чалавека можна параўнаць з птахам, адно крыло ў якога – мінулае, другое – будучае. Калі не дзейнічае адно крыло, то птах траціць раўнавагу, арыентацыю ў часе і прасторы і падае ў прорву бездухоўнасці.

**Вядучы 2:** Слушнае і яшчэ адно сцвярджэнне: "Калі ў чалавека няма патрыятычных пачуццяў, ён становіцца перакаці-полем, якому ўсё роўна, што гіне: культура, памяць ці зямля".

**Вядучы 1:** Пацверджаннем сказанага стане верш Васіля Жуковіча "Радзіма":

Малая радзіма… Правал паміж слоў,
Хоць нехта ў іх сплаў і паверыў;
Назваў нехта раптам святыню малой,
Аднёс яе ў шэраг памераў.

Існуе малы пералесак, лясок,
І рэчка малая, і поле …
Куток, дзе ступіў ты найпершы свой крок,
Малым не бывае ніколі.

Існуе малая трава і лаза,
Крыніцы вузенькае ложа.
Куток, дзе ты першае слова сказаў,
Малым называцца не можа.

Радзіма… У ёй да скanання вякоў
Прастору душа набывае.
Магчыма, бывае малая любоў,
Святыні малой не бывае.

**Вядучы 2:** Навучыцца правільна арыентавацца ў часе і прасторы, любіць сваю малую радзіму, цаніць і берагчы яе культуру дапаможа нам конкурсна-пазнавальная гульня.

**Вядучы 1:** Сённяшняя гульня складаецца з 3 тураў: “Што? Дзе? Калі?”, “Сем падказак”, “Літаратурны брэйн-рынг”. За ходам гульні будзе сачыць кампетэнтнае журы…

**Вядучы 1:** У складзе каманды вучні…

**I тур**
**“Што? Дзе? Калі?”**

**Вядучы 2:** У гульні прымаюць удзел 2 каманды па 6 чалавек. Пераможцай стане каманда, удзельнікі якой правільна выканаюць заданні. За кожны правільны адказ каманда атрымлівае 1 бал. Калі адна з каманд не дае адказу ці памыляецца, другая каманда мае права прапанаваць свой варыянт. Каманды могуць браць падказкі і ад сваіх балельшчыкаў. Самаму актыўнаму з балельшчыкаў у фінале ўручаецца заахвочвальны прыз. У ролі вядучага выступае настаўнік. Дапамагаюць у правядзенні гульні члены літаратурнага аб’яднання “Сцяжынкамі натхнення”.

**Пытанні:**

- ✔ Адзін з вершаў магілёўскага паэта пачынаецца так:
  Вясна на Бесядзі, на Друці…
  Хто аўтар гэтых радкоў? *(А.Пысін)*
- ✔ У якім годзе літаратурнаму аб’яднанню “Натхненне” было прысуджана званне лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола Магілёўшчыны? Хто яго першы сакратар? *(1980, А.Пліндоў)*

Паважаныя гульнёўцы, праслухайце, калі ласка, пазыўныя праграмы “Радыё “Бялынічы”. Назавіце песню, якая лягла ў аснову пазыўных радыё, хто яе музычны апрацоўшчык? *(Віктар Халадцоў, песня “Бялынічане, бялынічанкі…”)*

- ✔ Зміторк Марозаў, бялыніцкі літаратар, які зараз жыве і працуе ў Мінску, напісаў твор, які па сваёй форме стаў першым ва ўсходнеславянскай літаратуры. Што гэта за твор? Растлумачце. *(“Апакаліпсіс душы”, яго форма – вянок вянкоў санетаў, які складаецца з 14 санетаў, а апошні – з яго магістралаў)*
- ✔ Вашай увазе прадстаўлены прадметы: ліст паперы і пэндзлік, ліст паперы і ручка. Але ёсць яшчэ нешта, што іх аб’ядноўвае ў адно. Што гэта? *(Чорная скрыня – кніга В.Карамазава з аповесцю “Крыж

*на зямлі і поўня ў небе", у якоў ён апісвае жыццё мастака В.К.Бялыніцкага-Бірулі)*

- ✔ Агульнавядома, што бітва на Нямізе адбылася ў Мінску, а Мікола Целеш, бялыніцкі літаратар, даказвае, што ў іншым месцы. У якім? Прывядзіце аргументы. *(Паміж Заазер'ем і Эсьмонамі, бо Зззаазерская рэчка раней (сцвярджаюць старажылы) называлася Няміза, а мінская – Няміга. На тэрыторыі ваколіцы захавалася шмат гарадзішчаў)*
- ✔ Назавіце членаў літаратурнага аб'яднання якое дзейнмчала пры раённай газеце "Зара над Друццю" і іх старшынь. *(Старшынямі ў свой час былі: А.Пліндоў, В.Хаўратовіч, Р.Яўсееў, У.Серыкаў, М.Радоўскі)*
- ✔ На Магілёўшчыне шмат таленавітых пісьменнікаў. Дваім прысуджаны высокія званні – народны пісьменнік Беларусі. А менавіта каму? *(Аркадзю Куляшову і Івану Чыгрынаву)*

***Падвядзенне вынікаў.***

## II тур
## "Сем падказак"

Вядучы загадвае некалькі вядомых асобаў, якія маюць дачыненне да літаратуры Бялынiччыны, і дае па 7 падказак. Хто адгадае асобу з 1-й падказкі, атрымлівае 7 балаў, з 2-й – 6 балаў і г.д.

### 1-ая асоба

1. Піша на рускай і беларускай мовах.
2. За грошы ад Дзяржаўнай прэміі СССР пасадзіў 18 гектараў лесу на Палессі.
3. Пасля пераезду ў Маскву стаў членам рэдкалегіі часопіса "Юность".
4. Першы друкаваны верш у 1956 годзе.
5. Аўтар нататак пра літаратуру "Паэзія-львіца з грывай".
6. Лаўрэат дзяржаўнай прэміі СССР 1987 года за кнігу "Слухаю неба і зямлю".
7. Жыве ў Маскве.

   *(Ігар Шклярэўскі)*

### 2-ая асоба

1. Лаўрэат дзвюх літаратурных прэмій.
2. Член Саюза пісьменнікаў Рэспублікі Беларусь з 1993 года.
3. Працаваў ў Мінску ў Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання.
4. Аўтар апавяданняў аб раслінах "Азбука агранома Валошкі".
5. Санет – крутая вяршыня майстэрства.

6. Аўтар першага ў еўрапейскай літаратуры вянка вянкоў санетаў “Апакаліпсіс душы”.
   *(Змітрок Марозаў)*

**3-ая асоба**

1. Ветэран вайны.
2. Усю вайну вёў дзённік.
3. Вядзе перапіску з членамі літаратурнага аб’яднання “Сцяжынкамі натхнення”.
4. Былы старшыня літаратурнага аб’яднання “Натхненне” пры раённай газеце “Зара над Друццю”.
5. Узнагароджаны знакам “Выдатнік народнай адукацыі”.
6. Зараз жыве ў Гомелі.
7. Аўтар зборніка “Я бы мог погибнуць в сорок третьем”.
   *(Алег Пліндоў)*

**4-ая асоба**

1. Аўтар верша “Ручэй”.
2. Узнагароджаны Граматай за творчую работу ў конкурсе “Не пакідайце ж мовы нашай беларускай”.
3. Піша музыку на свае вершы.
4. Выдаў зборнік вершаў “Мары юнацтва”.
5. Закончыў сярэднюю агульнаадукацыйная школу № 1 г.п.Бялынічы ў 2006 годдзе.
6. Аўтар казкі “Сказочный народ”.
7. Завуць Сяргей.
   *(Сяргей Скамейка)*

*Падвядзенне вынікаў.*

**III тур**
**“Літаратурны брэйн-рынг”**

Удзельнічаюць дзве каманды. Першай адказваць мае права тая каманда, якая хутчэй падасць сігнал званочкам. За кожны правільны адказ налічваецца 1 бал. На абдумванне адказаў даецца 1 хвіліна. Бліц-пытанне – гэта тры пытанні, кожнае з якіх абмяркоўваецца 20 секунд (1 бал – за кожны правільны адказ). У выпадку няправільнага адказу першай каманды другая каманда (калі яшчэ не прайшла хвіліна) мае права даць адказ.

**Пытанні:**

1. Каму з бялыніцкіх літаратараў належаць вядомыя радкі: “Край Прыдруцкі, сэрцу блізкі, песня лепшая мая…” *(Віктару Хаўратовічу)*

2. Паслухайце ўрывак з песні (гучыць запіс песні “Бялынічы” ў выкананні студыі “Колеры”). Хто аўтар гэтай песні? *(Лаппо-Шышло Святлана)*
3. Карткі з літарамі. Не змяняючы парадак літар, знайдзіце спосаб прачытаць два словы – псеўданім пісьменніка і назву яго твора. *(Моціч “Знаходка”)*

*(Заўвага: псеўданім чытаецца з першай літары праз адну, злева направа, назва адпаведна – справа налева.)*

4. Назавіце вядомых сатырыкаў Прыдруцкага краю. *(В.Найдзін, Р.Яўсееў, М.Падабед)*
5. Якая тэматыка зборніка “Праменьчык сонца ў душы маёй”, які змяшчае вершы літаратараў Прыдруцкага краю. *(Любоў да бацькаўшчыны, замілаванне роднымі краявідамі, асэнсаванне гісторыі і чалавечага жыцця, каханне)*
6. Бліц. Назавіце:

- 2 кнігі краязнаўцы А.Марозава *(“Зямля Бялыніцкая”, “Белыничский монастырь”)*;
- 2 кнігі М.Карпечанкі пра гістарычныя падзеі *(“Галоўчын”, “Вочы гісторыі”)*;
- любую брашуру В.Гузава *(“Маё жыццё, мае пакуты”, “Народныя таленты”...).*

7. Паэт, які прыйшоў у літаратуру з мэтай паяднання высокіх святых званняў Паэта і Хлебароба. *(З.Марозаў)*
8. Лейтматыў зборніка З.Марозава “Сын чалавечы”. *(Любоў да роднай зямлі, прырода, нялёгкая праца хлебароба)*
9. У адным з вершаў З.Марозава ёсць словы:

Кумір Петраркі, верны друг Шэкспіра, -
Санет маёй сумленна служыць ліры,
Ён ключ, якім я адмыкаю …
Назавіце апошняе слова страфы. *(Свет)*

***Падвядзенне вынікаў.***

***Узнагароджанне каманд.***

***Рэфлексія.***

**Вядучы 1:** Што для кожнага з вас азначаюць словы, узятыя ў якасці эпіграфа?

(Камандзе-пераможцы ўручаецца зборнік “Жизни круг”, які выдаецца ў школе)